## Імёны і падзеі ў датах

# Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы — 80 гадоў

*К. Д. Варанько,*
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**Буйным шматпрофільным навукова-адукацыйным цэнтрам Гродзенскага рэгіёна з'яўляецца Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Датай заснавання лічыцца 22 лютага 1940 года, калі Савет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову № 209 «Аб мерапрыемствах па арганізацыі народнай адукацыі ў заходніх абласцях БССР». Згодна з ёю быў створаны Гродзенскі настаўніцкі інстытут, дырэктарам якога стаў С. Я. Раскін.**

На І курс прынялі крыху больш за сто студэнтаў. Заняткі пачаліся 7 сакавіка 1940 года. На аддзяленнях беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры і фізіка-матэматычным рыхтавалі настаўнікаў V—VII класаў няпоўнай сярэдняй школы. Праіснаваў Гродзенскі настаўніцкі інстытут нядоўга. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, нямецка-фашысцкія захопнікі, якія акупіравалі горад на наступны дзень, знішчылі абсталяванне і навучальныя кабінеты, 15-тысячны фонд бібліятэкі быў спалены, у памяшканнях інстытута арганізавалі шпіталь.

Пасля вызвалення Гродна ў ліпені 1944-га пачалася падрыхтоўка да адкрыцця інстытута. На аснове распараджэння Савета Народных Камісараў СССР ад 20 кастрычніка 1944 года ён пераўтвораны ў Гродзенскі педагагічны інстытут. Дырэктарам прызначылі М. В. Уласаўца. Падрыхтоўка вялася на трох факультэтах — фізіка-матэматычным, літаратурным і замежных моў. На першых двух былі арганізаваны завочныя аддзяленні. У жніўні 1949-га на пасаду дырэктара інстытута быў зацверджаны І. М. Малюкевіч. Пазней адкрыліся гістарычны і біёлага-хімічны факультэты, арганізавана аспірантура. У 1957 годзе ўстанове адукацыі нададзена імя Янкі Купалы.

У 1978 годзе на базе педагагічнага інстытута быў заснаваны Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для высокатэхналагічных вытворчасцей і педагогаў для масавай школы, здольных арганізаваць навучанне, якое адпавядала б новым патрабаванням. Пастанова аб яго арганізацыі была прынята Саветам Міністраў БССР 27 чэрвеня 1977 года. Першы набор здзейснены ў верасні 1978-га. Рэктарам універсітэта быў прызначаны А. В. Бадакоў. У структуры навучальнай установы тады налічвалася



Галоўны корпус Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы

пяць факультэтаў: матэматычны, фізічны, гістарычны, філалагічны і факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Працаваў факультэт даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, а таксама факультэт маладых настаўнікаў-стажораў. Дзейнічалі 25 кафедраў і курс грамадзянскай абароны.

У 1978/1979 навучальным годзе працавалі 236 выкладчыкаў, у тым ліку 3 дактары навук, з іх 1 прафесар, 101 кандыдат навук, 60 дацэнтаў і старшых навуковых супрацоўнікаў. На працягу дзесяці гадоў (1978—1988) універсітэт не насіў імя Янкі Купалы. Толькі 13 верасня 1988 года ўстанове адукацыі зноў прысвоена імя народнага паэта. У 1988/1989 навучальным годзе на сямі факультэтах: філалагічным, матэматычным, фізічным, гістарычным, біялагічным, правазнаўства, педагогікі і методыкі пачатковага навучання — займаліся 2250 студэнтаў стацыянарнай, 1750 — завочнай і 312 — вячэрняй формаў навучання. Універсітэт рыхтаваў кадры па 9 спецыяльнасцях і 16 спецыялізацыях.

У 1989 годзе быў адкрыты факультэт фізічнага выхавання, у 1990-м — інжынерны, у 1991-м — факультэт беларускай філалогіі і культуры. У пачатку 1994 года рэктарам стаў Л. М. Ківач. У гэты перыяд пачалося пераўтварэнне ВНУ пераважна педагагічнага кірунку ў шматпрофільны ўніверсітэт — цэнтр адукацыі, навукі і культуры. У першай палове 1994 года адбыліся аб'яднанне і перапрафіляванне факультэтаў: інжынерны і фізічны факультэты аб'ядналіся ў інжынерна-фізічны, аддзяленні правазнаўства і міжнародных адносін — у факультэт права і эканомікі, з філалагічнага факультэта ў самастойны вылучылася аддзяленне замежных моў. Тры факультэты атрымалі новыя назвы: з'явіліся факультэты біялогіі і экалогіі, гісторыі і культуры, псіхалогіі і педагогікі. У 1997 годзе факультэт права і эканомікі быў рэарганізаваны ў два: юрыдычны і факультэт эканомікі і кіравання, а факультэт замежных моў увайшоў у склад філалагічнага факультэта на правах аддзялення.

У верасні 1997 года да кіраўніцтва Гродзенскім універсітэтам прыйшоў С. А. Маскевіч. З 2001-га па 2006 год у склад універсітэта ўключаны Інстытут паслядыпломнай адукацыі і чатыры каледжы: ваўкавыскі, лідскі, гродзенскія тэхналагічны і гуманітарны.

З 2005-га па 2013 год рэктарам установы адукацыі быў Я. А. Роўба. Пад яго кіраўніцтвам ва ўніверсітэце пашырыўся пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый. Створаны ваенны, інжынерна-будаўнічы факультэты, факультэт турызму і сэрвісу, факультэт інавацыйных тэхналогій машынабудавання. У 2010 годзе ўніверсітэту была ўручана Прэмія Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці. За асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў і ў сувязі з 70-годдзем з дня заснавання Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь універсітэту прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Беларусі. У сакавіку 2013 года рэктарам універсітэта прызначаны А. Д. Кароль, а ў снежні 2017-га рэктарам стала І. Ф. Кітурка.

Сёння Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы — цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў, магістраў, кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. У структуру ўстановы адукацыі ўваходзяць 15 факультэтаў, 75 кафедраў, шэраг структурных падраздзяленняў. Навучанне здзяйсняецца на дзвюх ступенях вышэйшай адукацыі: падрыхтоўка спецыялістаў і магістраў. Студэнты першай ступені вучацца на вочнай і завочнай формах.

У 2011 годзе ўніверсітэт атрымаў статус навуковай арганізацыі. Пастаянна развіваюцца новыя кірункі супрацоўніцтва з установамі, арганізацыямі, прамысловымі прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь па ўкараненні атрыманых вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак, выкананні пілотных праектаў па тэхналагічных запытах прадпрыемстваў. Найважнейшыя распрацоўкі спецыялістаў універсітэта абаронены патэнтамі, укаранёны і прыносяць эканамічны эфект на большасці прадпрыемстваў Гродзенскага рэгіёна. Таксама ўніверсітэт займаецца міжнароднай дзейнасцю. Удзел у міжнародных праектах, адукацыйных праграмах дазваляе развіваць мабільнасць студэнтаў і супрацоўнікаў з мэтай набыцця і ўкаранення перадавога міжнароднага вопыту, пашырэння прафесійных ведаў і навыкаў, распрацовак і рэалізацыі праектных ідэй, умацавання іміджу ўстановы. Універсітэт карыстаецца папулярнасцю ў замежных студэнтаў, дае ім шырокія магчымасці для навучання і самавыяўлення, што з'яўляецца важнай складаючай знешнеэканамічнай дзейнасці. Установа мае матэрыяльна-тэхнічную базу: вучэбныя карпусы, камп'ютарныя класы, навуковую бібліятэку з філіяламі, музей, інтэрнаты, стадыёны, тэнісныя корты, футбольныя пляцоўкі, спартыўныя залы.

Вялікая ўвага ва ўніверсітэце надаецца пазавучэбнай рабоце са студэнтамі. Для гэтага створаны ўсе неабходныя ўмовы. Працуюць творчыя калектывы, рэалізоўваюцца маладзёжныя і сацыяльныя праекты. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у спартыўна-масавых і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах горада, вобласці, рэспублікі. Гонарам універсітэта з'яўляюцца яго выпускнікі — алімпійскія чэмпіёны: А. Цюненкова, В. Корбут, А. Курловіч, К. Лукашык, І. Шылава, а таксама прызёры Алімпійскіх гульняў: І. Ціхан, А. Паўлаў, В. Цыленьць, П. Пачынчук.

Навуковыя публікацыі студэнтаў і супрацоўнікаў змяшчаюцца ў часопісе «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы». Дзейнасць установы адукацыі адлюстравана на старонках газеты «Гродзенскі ўніверсітэт» і ў Сусветнай камп'ютарнай сетцы. Інтэрнэт-рэсурсы ўключаюць больш за 50 сайтаў, а таксама персанальныя блогі, групы ў сацыяльных сетках і медыяканалы, прысвечаныя розным аспектам навучальнага, навуковага і грамадскага ўніверсітэцкага жыцця. Афіцыйны сайт www.grsu.by змяшчае актуальныя навіны, даведачную інфармацыю аб усіх відах дзейнасці ўстановы адукацыі.

Гродзенскі універсітэт імя Янкі Купалы // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1997. — Т. 5. — С. 439.

Гродненский государственный университет имени Янки Купалы // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. — Минск, 2006. — Т. 3. — С. 235.

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск, 1996. — Т. 3. — С. 134.

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. — Мінск, 2012. — Т. 3. — С. 223.

Гродненский государственный университет имени Янки Купалы // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. — Т. 4 : Гродненская область : в 2 кн. — Минск, 2014. — Кн. 1. — С. 220—221.

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 264—266.

Гродненский государственный университет имени Янки Купалы = Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы = Yanka Kupala State University of Grodno : [75 лет]. — [Б. м. : б. и., 2015?] (Минск : Дивимакс). — 76, [1] с. : ил., цв. ил., портр., факсим. — На рус., белорус. и англ. яз.

Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы — 75 гадоў / А. Д. Кароль [і інш.] // Вышэйшая школа. — 2015. — № 1. — С. 3—36.

*Китурко, И. Ф.* Гродненский государственный университет имени Янки Купалы / И. Ф. Китурко // Вузовская наука Беларуси / сост. : С. Г. Девяткова, Т. И. Жуковская, В. Ф. Николайчук. — Минск, 2017. — С. 276—285.

*Карев, Д. В.* Гродненский государственный университет имени Янки Купалы (ГрГУ им. Я. Купалы) / Д. В. Карев // Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI — нач. XXI в.) / Д. В. Карев ; Гуманит. центр исслед. Восточ. Европы, УО «Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы», фак. искусств и дизайна, Центр междисциплинар. исслед. диаспор и зарубеж. белорусоведения. — Минск, 2018. — С. 115—117.

*Золотухин, Ю. П.* Очерк истории Гродненского университета : [1940—1978 гг.] / Ю. П. Золотухин // Веснік адукацыі. — 2010. — № 2. — С. 66—72.

*Кароль, А.* Канцэпцыя руху наперад : гутарыла Святлана Воцінава / А. Кароль // Маладосць. — 2017. — № 7. — С. 72—76.